ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№1(1194)
ЧАЦВЕР,
13 студзеня
2011 г.
*Выходзіць два разы ў месяц*
*Цана дагаворная*

# Гомельскі ўніверсітэт



*Газета заснавана ў верасні 1969 года*

## КАДРАВЫЯ ПЕРАМЕНЫ

**Прэзідэнт Беларусі А.Р. Лукашэнка 28 і 29 снежня 2010 г. разгледзеў кадравыя пытанні і прызначыў на шэраг дзяржаўных пасад новых кіраўнікоў.** Як паведаміла БЕЛТА, **МАСКЕВІЧУ Сяргею Аляксандравічу**, доктару фізіка-матэматычных навук, даверана пасада міністра адукацыі краіны. Ён працаваў у Гродзенскім дзяржуніверсітэце імя Я. Купалы спачатку прарэктарам па навуковай рабоце, з 1997 г. па снежань 2010 г. – рэктарам ГрДУ. Старшынёй Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прызначаны **РУСЕЦКІ Анатоль Максімавіч,** доктар тэхнічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі. У 2002-2003 гг. ён з'яўляўся старшынёй Камітэта па навуцы і тэхналогіях, з 2003 па 2009 г. – міністр прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

## НА САВЕЦЕ ЎНІВЕРСІТЭТА

На яго апошнім у 2010 годзе пасяджэнні абмеркаваны вынікі атэстацыі ГДУ, якая праводзілася ў нашай ВНУ напярэдадні Новага года. З інфармацыяй выступіў рэктар А.У. Рагачоў. Як адзначыў Аляксандр Уладзіміравіч, камісіяй прынята рашэнне атэставаць наш універсітэт на наступныя 5 гадоў, што з'яўляецца следчаннем зладжанай, паспяховай работы калектыву ГДУ ва ўсіх сферах яго жыццядзейнасці. Разам з тым неабходна зрабіць адпаведныя вывады і сканцэнтраваць свае намаганні на слабых месцах, якія былі выяўлены падчас праведзенага атэстацыйнай камісіяй анкетавання выкладчыкаў і студэнтаў. На пытанні анкеты аб іх удзеле ў выкананні вучэбна-метадычнай, навуковай работы, у грамадскім жыцці было нямала адмоўных адказаў, што для ВНУ універсітэцкага тыпу з'яўляецца недапушчальным. Рэкамендавана дэталёва абмеркаваць такое становішча на кафедрах факультэтаў для выпраўлення адзначаных недахопаў.

Заслухана таксама інфармацыя старшыні прафкама студэнтаў С. Азяўчыкава і сакратара пярвічнай арганізацыі ГА "БРСМ" ГДУ В. Славінай аб дзейнасці маладзёжных грамадскіх арганізацый універсітэта, рады якой складаюць адпаведна 96,5 % і 23 % студэнтаў.

*Уважаемый Александр Владимирович!*

*Искренне поздравляю Вас с Новым, 2011 годом.*

*Посвятив себя благородной миссии обучения и воспитания молодого поколения, Вы с честью исполняете свой долг. В уходящем году Ваш вуз внес достойную лепту в развитие высшей школы Беларуси, дал путевку в жизнь многим прекрасным специалистам.*

*Скоро Беларусь перешагнет порог нового пятилетия, в котором нам предстоит совершить интеллектуальный прорыв, многократно приумножив духовные богатства Отечества. Верю, что совместными усилиями мы добьемся успеха в этой большой и важной работе.*

*Пусть Новый год станет для Вас и всего Вашего коллектива временем дальнейшего плодотворного труда на благо Отечества.*

*Желаю Вам и всем преподавателям, сотрудникам, студентам Вашего вуза крепкого здоровья, удачи, счастья и благополучия.*

*Президент Республики Беларусь*

*Александр Лукашенко.*

## ВОСПИТЫВАТЬ СООБЩА

**В рамках работы созданной в нашем университете в конце 2009 года школы куратора в конференц-зале прошло заседание круглого стола на тему: «Идеологическое и гражданско-патриотическое воспитание: опыт и перспективы».**

Перед его участниками – преподавателями, курирующими студенческие группы, выступила заместитель начальника управления воспитательной работы с молодежью ГГУ С.Л. Милехина. Она проинформировала об итогах II Республиканского смотра-конкурса студенческих проектов «С гордостью за прошлое, с заботой о настоящем, с верой в будущее». Как рассказала Светлана Леонидовна, на нем был достойно представлен и наш вуз – проект «Правовая культура – молодым» клиники «Живое право» СНУЛ «Юридическая клиника» юрфака отмечен Дипломом III степени в номинации «Молодежный лидер XXI века».



Фото В. Чистика.

О том, как будущие правоведы пришли к такому весомому результату, а также о насыщенной деятельности клиники рассказала и представила соответствующую мультимедийную презентацию ее руководитель старший преподаватель кафедры гражданско-правовых дисциплин Л.П. Васильева. По ее словам, привлечение будущих правоведов к таким формам внеурочной работы позволяет сделать их досуг интересным и содержательным, содействует развитию профессиональных навыков студентов, способствует формированию у них лучших человеческих качеств.

Полезным для кураторов, перед которыми поставлена важная задача привлекать студенческую молодежь к здоровому образу жизни, было выступление преподавателя кафедры теории и методики физической культуры Е.В. Гусинца. Один из координаторов международной программы помощи бросающим курить «Дышите свободно» в Гомеле убедил коллег в том, что она способна сослужить хорошую службу и в ГГУ, где активизирована работа по борьбе с пагубной привычкой.

Педагог-психолог УВР Ю.А. Воронина озвучила предварительные итоги проведенного среди первокурсников анкетирования, которое было направлено на изучение их отношения к проблемам общественной, экономической и социальной жизни. Проанализировав результаты мониторинга, участники круглого стола определи круг важных задач, требующих к себе особого внимания. Так, у многих из опрошенных студентов возникают трудности в процессе адаптации к вузу, не у всех первокурсников вызывают интерес проводимые с ними кураторские часы, остается низким уровень их участия в общественной жизни университета. В разрешении этих и других актуальных проблем кураторам помогут в управлении воспитательной работы с молодежью, заверила С.Л. Милехина.

**(Наш корр.).**

## СТИПЕНДИИ ПРЕЗИДЕНТА – ТАЛАНТЛИВЫМ МОЛОДЫМ УЧЕНЫМ

**92 человека, которые активно и плодотворно занимаются научными исследованиями, удостоены материальной поддержки главы государства на 2011 год, из них 24 молодых ученых работают в учреждениях Министерств образования. В числе почетных стипендиатов оказались и 3 представителя гомельских вузов: 2 – ГГУ им. Ф. Скорины и 1 – ГГТУ им. П.О. Сухого.**

**Весомую денежную добавку от Президента в размере 1 400 000 руб. в месяц будут получать ассистент кафедры экономической теории и мировой экономики Александр Баранов и к.т.н., доцент кафедры радиофизики и электроники Максим Ярмоленко.**

**Сессия — Сессия — Сессия — Сессия**

## ЗА «СЧАСТЛИВЫМ» БИЛЕТОМ

**«... Вытянуть на экзамене заветный «счастливый» билет, выученный от «А» до «Я», блеснуть перед преподавателем своим интеллектом и получить желанную и вполне заслуженную «десятку»...». Сейчас, когда в ГГУ в самом разгаре ответственная и волнительная зимняя экзаменационная сессия, этой мечтой живут все без исключения студенты. И если не полагаться полностью на фортуну, а запастись прочными знаниями, она обязательно сбудется. В этом умники и умницы нашего университета, которые берегут зачетные книжки только для высоких оценок, уверены на все сто процентов.**



В их числе и студентка гр. И-32 исторического факультета Наталья Борщевская. Ее исчерпывающий ответ на экзамене по истории Беларуси к.и.н., доцент В.П. Пичуков оценил по-максимуму – на 10 баллов. Показала прочные знания по истории своей Родины и первокурсница филологического факультета Полина Бондаренко, которая уверенно выдержала один из первых в своей студенческой жизни экзаменов, который принимала к.и.н., доцент Т.И. Езепова, и получила «девятку». Такой же высокий балл заработала на экзамене по гидрологии студентка гр. ГН-21 геолого-географического факультета Евгения Волович. Ей действительно было чем порадовать своего преподавателя ассистента кафедры географии Т.Г. Флерко.





«... А, может быть, шпаргалки есть – ума не надо!», – подумают те, кто не прочь поохотиться за удачей и «поймать ее за хвост». Но все-таки опыт доказывает обратное: такие «знайки» и на самом деле чаще всего оказываются с «хвостом», вот только от него потом приходится избавляться. А ликвидация академических задолженностей, как известно, требует не только эмоциональных, но и материальных затрат. Об этом при подготовке к очередному экзамену забывать не стоит...

**(Наш корр.)**
**Фото В. Чистика.**

# Літаратурная старонка

## TAT TWAM ASI (ГЭТА ЁСЦЬ ТЫ)

*І снегу насеялася,*
*і маладзік*
*прарэзаўся: ліхтары*
*ў бадзёрым настроі.*
**(А. Разанаў)**

Надыход зімы прывеціў сваім візітам у сцены ГДУ імя Ф.Скарыны паэт і філосаф Алесь Разанаў. Напярэдадні выйшлі дзве кнігі творцы: "З апокрыфа ў канон: гутаркі, выступленні, нататкі" і "Воплескі даланёю адною (зборнік пункціраў)". Мэтай сустрэчы з'яўляліся абмен думкамі наконт дадзеных выданняў і абмеркаванне стану сучаснай беларускай літаратуры. Студэнтам, дапытліваму народу, у сваю чаргу было цікава пазнаёміцца ўласна з асобай паэта, шматграннасцю яго індывідуальнасці і таленту.

Як заўважыла д.ф.н., прафесар кафедры беларускай літаратуры ГДУ В.К. Шынкарэнка, А. Разанаў – гэта заўсёды вага глебы і глыбы. Выразна вылучаюцца некалькі этапаў у творчасці паэта: палёт маладога арла, які шырока і рэльефна бачыць, вынікам чаго з'явіліся вершаказы, версэты, зномы, і сённяшні Разанаў, чые прасторы – завоблачныя вышыні, адкуль убачанае перадаецца кропкамі-пункцірамі.

Нельга не пагадзіцца з дадзенай характарыстыкай творчасці масцітага паэта. "З вяршыні гары лепш відаць, як нязначна ўсё, што ўнізе", – пісаў П. Каэльа. Але гэтыя дэталі набываюць асаблівы змест для паэта. Таму нездарма асноўнай рысай творчасці А. Разанава з'яўляецца філасафізм. "Для мяне Алесь Разанаў – гэта сінонім слову "філасафічнасць". Паміж імі можна паставіць знак роўнасці. І жанравае азначэнне яго творам – філасафемы (ці што?) у шырокім разуменні", – падзялілася сваімі ўражаннямі студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта Д. Мальцава.

А што ж да асобы самога паэта? Па словах А. Разанава, літаратура апісвае чалавека з розных бакоў, але нечага істотнага недагаворвае. Вось гэта невымоўнае і ёсць змест усёй літаратуры. Калі метазмест твора выводзіцца – можна лічыць, што твор здзейсніўся, і здзейсніўся вельмі моцна. У выпадку, калі нейкія радкі аўтара становяцца народнымі, бедаваць не варта. "Кожны недасканалы твор мае патрэбу ў аўтары. Дасканалы – не", – сцвярджае А. Разанаў.

Працэс жа напісання твораў паэт параўноўвае з... рыбалкай. "Гэта падобна кручку, які ты схапіў, – тлумачыць Алесь Сцяпанавіч. – Гэты кручок цябе цягне, але ты, насуперак чакаемаму, не адпускаеш яго, а паварочваеш усё так, каб абставіны працавалі на цябе. І, у рэшце рэшт, атрымліваеш вынік. Такім чынам, з рыбіны ты пераўтвараешся ў рыбака.

Творчасць рамантычнага рыбака – тая субстанцыя, якая пульсуе паміж целам і духам, – знітавана з Беларуссю, з роднай мовай. Ніадкуль не ідуць такія імпульсы, як з Радзімы. Да таго ж сама мудрасць растворана ў прыродзе, у наваколлі, у людскіх душах жыхароў роднай зямлі. Нават калі ў творцы не будзе чытача, ён будзе тварыць: ёсць невідавочнае, адкуль прыходзіць натхненне".

Праломваць паверхню відавочнага, дабірацца да сэнсу патаемнага – заклік творцы. "Я буду ўсімі фібрамі душы падтрымліваць вашыя намаганні. Бо сама рэчаіснасць зацікаўленая ў тым, каб кожны выявіўся. Месца пад сонцам хапае ўсім", – адзначае паэт.

А. Разанаў падараваў свае зборнікі бібліятэцы ГДУ, у яго планах – папаўненне яе абанементаў новымі выданнямі.

Скончылася дзейства (так і хочацца напісаць – свяшчэннадзейства) раздачай аўтографаў жадаючым.

Неабходна падзякаваць выкладчыкам кафедры беларускай літаратуры за арганізаваную сустрэчу з выдатным паэтам.

**Марына МАРКЕВІЧ,**
**студэнтка гр. БА-53 філфака.**

---

**Ганна НОВІК,**
**студэнтка гр. БЖ-32 філфака.**

***

Давай пагутарым, Паэце,
Сашлем маркоту ... у Сібір!
Здаецца, спяць усе на свеце,
Мы ж баламуцім гэты вір.

Халодна. Ноч. Цягнік. ...Як зорна!
Купэ асветлена ледзь-ледзь.
Не супакоіць дух вандроўны,
Праз змрок густы ляцець, ляцець.

У шклянку кіпень, Lipton, цукар
І бразнуць лыжачкай... Цішэй;
Размовы нашы, спрэчкі, гумар
Не для аўтсайдэрскіх вушэй.

Накрэмзай верш мне на сурвэтцы,
Апошнім стрыжнем напішы.
Пра тое, што ў цябе на сэрцы,
Што надакучылі дажджы,

Што Муза зноў кудысь зваліла,
Што хочаш аднаго – тварыць...
...На спіне шнары. То ад крылаў.
Я ведаю: табе баліць.

---

**Яўген ІХОНКІН,**
**студэнт гр. БЖ-32 філфака**

***

Святло пахмурна праваджаючы,
Адной ідзеш ты марыць ў сне,
І, ціха шторы прыкрываючы,
Не чуеш, што патрэбна мне.

Але ў вачах тваіх – міжволі –
Парэшткі жарсці да таго,
Хто не заўважыць (о,ніколі!)
Вачэй, што плачуць без яго.



...Я ў горычы тваёй слязінкі
Жыць хочу не адзіны век.
Ды толькі дробныя дажджынкі
Мне зараз сталі, бы начлег.

Бо толькі... мара твая – ён!
А ты – мой слодыч і праклён...

---

**Анастасія КАЦЮРГІНА,**
**студэнтка гр. БФ-21 філфака**

***

Аблятае задумлівы сад,
Жоўты яблык зрываецца з голля.
Да цябе, як да колішніх страт,
Не дайсці, не даплысці ніколі.

Сіні прыцемак. Сонца ў траве.
Дзень адыйдзе за сонны пагорак.
Нехта яблыкі ўночы страсе
Разам з кроплямі жнівеньскіх зорак...

***

Зноў без пярсцёнка толькі рукі,
Як крылы белыя ляжаць.
Ля дзён тваіх з самотных гукаў
Ты вучыш плакаць і кахаць...
І вечным сцюжам, снам не верыць.
Ва ўсім яна. Жыве падман!
Хай прыйдзе снег у восень белы –
Ён перапіша наш раман!

### ПАДАРЫ МНЕ ВОСЕНЬ...

Падары мне восень кропелькаю ў сэрца
Ранкаў ледзь вільготных з прысмакам
зямным
Вогнішчаў. А верыш, мне ўжо здаецца
З сонцам у абдымках верасня стаім.
На далоні восень лісцікам самотным,
Вогненным, гарачым... Ён такі, як я.
Падарунак, скажаш, можа ўжо не модны.
Вострым шчасцем ў сэрца... Вось! Яна – твая!

### ПАЛАНЯНКА

Твой ціхі сон напісаны, як вяззю,
Адвечна-мяккім росчыркам святла.
Я тут Яго палонніца, а Князю
Казалі ўсе:
– Палоніць спакваля...
Тут віўся попел – ночы той жаданне –
Тут жаль світанак у сэрцы лёгкім звіў...
Прачнуўся Ён... Усмешкаю разліў
Між подыхамі нашымі каханне!



*Графіка зімы.*
**Фота У. Чысціка.**



---

**Ганна ШВЕДАВА,**
**студэнтка гр. БЖ-32**
**філфака**

***

Зачыняюцца дзверы,
Ты сыходзіш у імглу,
У цябе толькі веру,
Ты ж кідаеш адну.

Ноч канае ў знямозе,
Бессань цёмных вачэй...
І малю я ў трывозе:
"Ты вяртайся хутчэй"...

Не даеш мне адказу
І знікаеш ізноў...
Цемра ціснe адразу,
Ноч пазбаўлена сноў.

Ты вярнуўся, мой мілы,
Да мяне праз сто год.
Толькі сэрца астыла,
Скамянела, як лёд.

---

**Уладзімір ПАШУК**

### ЗІМЫ ВЯСНОВЫ ПРАМЕНЬ

Вясновае сонца,
Вясновы прамень
Фарбуе прастору,
Зімы светлацень.
Фарбуе бясконца
У самы кароткі дзень,

Фарбуе бясконца
Зімы светлацень.

І ззяе лагодна,
А снег аж блішчыць,
А сэрцу пяшчотна,
Зусім не маркотна,
І хочацца, хочацца,
Хочацца жыць!

---

**Ольга САВИЦКАЯ,**
**студентка гр. БФ-21 филфака**

### PIANO

Я окунаюсь в ночь,
Я растворяюсь в ней.
Ах, как беспечна дочь
Этих земных теней.
Яркий софит фонаря
И перестук колес...
Звезды несмело горят,
Светятся россыпью слез,
Как декорация сна.
Запах спокойствия в нем.
Выпито небо до дна
Новым сияющим днем.

***

Я верю в милость мороза.
Я знаю – любовь без края...
Со мною озябшая роза немая...

***

Жемчужной дымкою укрыты
Все мысли о тебе.
Полотна окон счастьем сшиты,
Узоры на стене.
Там чья-то длинная дорожка
Вдоль рамы пробежит.
Снежинка – булки белой крошка
По воздуху летит...
Вся жизнь моя – круженье с ветром,
Свободна потому,
Что мне хватило снов и света,
Чтоб улететь к Нему.

---

**Арыя-Ульрыка ГАТАЛЬСКАЯ,**
**студэнтка гр. БФ-11 філфака**

***

На плоце суседнім і дрэвах сялібы
Кудлатая раніца косы часала.
Рукой нетаропкай ігрушыны, слівы
Шматкамі кудзелі сваёй спавівала.
Заплецены косы, прыбраны рупліва.
Зірнула з усмешкай, зляцела на дол.
І на развітанне растрэсла гулліва
Над садам маім лёгкіх мрояў прыпол.



---

## СВАЯ АТЛАНТЫДА

У Гомельскай спецыялізаванай Славянскай бібліятэцы адбылася прэзентацыя зборніка вершаў студэнта 5 курса філалагічнага факультэта Алеся Бараноўскага "Вясляр". Гэта ўжо другая кніга маладога паэта ( пасля "Чуйнага акна"), што спалучае ў сабе і філасофскія роздумы, і лірыку кахання, і замілаванне роднымі мясцінамі. Як адзначыла яе рэдактар і рэцэнзент, кіраўнік школы-студыі "Малады літаратар" Н. Шкляра, паэт надае свайму герою-весляру рысы мужнасці, адвагі, духоўнасці. Ён малюе свой свет, сваю Атлантыду.

Аўтар шмат эксперыментуе з формай: "Вясляр" уключае ў сябе, апроч агульнаўжывальных формаў, хоку, брахікалоны, рансараву страфу, трыялеты, верлібры...

У імпрэзе актыўны ўдзел прынялі студэнты і выкладчыкі з ГДУ. Парадавалі музычнымі падарункамі барды А. Мельнікаў і А. Кастэнка. Вялікую ўдзячнасць хочацца таксама выказаць ўдзельнікам літаб'яднання "Пралеска", акцёру Гомельскага абласнога драматычнага тэатра А. Бычкову, прадстаўніку рэдакцыі часопіса "Полымя" Р. Малахоўскаму, заснавальніку серыі "Аз" І. Бісеву, культурнаму дзеячу і мецэнату В. Вятошкіну, а таксама ўсім супрацоўнікам Славянская бібліятэкі.

**Ганна НОВІК,**
**студэнтка 3 курса філфака.**

# НОВОГОДНЕЕ ВОЛШЕБСТВО





**В фойе актового зала учебного корпуса №1 накануне Нового года прошел традиционный праздничный утренник для детей преподавателей, сотрудников, студентов, аспирантов и магистрантов. Самодеятельные артисты студенческого клуба ГГУ подготовили для детворы интересное новогоднее представление с участием доброго Деда Мороза, его неизменной спутницы Снегурочки, забавных гномов и других колоритных сказочных персонажей. Ребятишки, переодетые в зайчат, тигрят, волчат, маленькие «снежные королевы» с удовольствием демонстрировали свои яркие новогодние костюмы, участвовали в занимательных играх и конкурсах, танцевали, водили хороводы вокруг красавицы-елки.**

**Никто не остался и без сладких подарков, которые приобрел профком сотрудников университета.**

# ПОДРАСТАЮТ ОЛИМПИЙЦЫ

**В СОШ №72 состоялось спортивное мероприятие «Малые Олимпийские игры». Эта школа, открытая совсем недавно в новом микрорайоне г. Гомеля, по своему оснащению и оборудованию считается лучшей в городе.**

Такой спортивный праздник проводится здесь уже во второй раз и, судя по количеству зрителей, вызывает большой интерес не только у детей, но и у родителей. В «Малых Олимпийских играх» принимали участие ученики младших классов – всего 5 команд по 8 человек. А почетными гостями на празднике были начальник образования Центрального района г. Гомеля А.А. Шевель, преподаватели ГГУ им. Ф.Скорины: декан факультета психологии и педагогики М.Г. Кошман, доцент кафедры ТМФК В.Н. Старченко и старший преподаватель этой кафедры С.А. Иванов.

Спортивное мероприятие проходило под девизом: «Главный рекорд – здоровье!». А церемония его открытия была как на настоящих Олимпийских играх: со вступительной речью директора школы И.А. Савицкого, торжественным поднятием флага Республики Беларусь и даже зажжением факела!

Соревнования были очень хорошо организованы: с увлекательным сценарием, ярким оформлением зала, спортивной формой юных спортсменов, хорошим инвентарем – мячами, ракетками, шарами, обручами и т.д. Все 10 эстафет прошли на «ура!». А между ними были развлекательные паузы: от выступления девочек СОШ №72 по спортивной аэробике, песни в исполнении ученицы-старшеклассницы до познавательно-развлекательной разминки с младшими школьниками.

Среди 5 команд с символическими названиями «Звезды», «Спартанцы», «Олимпийцы», «Чемпионы» и «Силачи» победу одержала сборная 4 класса – «Олимпийцы». Однако остальные ребята не расстроились, ведь они получили заряд бодрости, энергии и хорошего настроения.

**Янина САВУШКИНА,**
**студентка 5 курса факультета физической культуры.**

## НА РОЖДЕСТВО – В КУКОЛЬНЫЙ ТЕАТР

**7 января дети в возрасте от 4-х до 8 лет вместе с родителями посмотрели спектакль в Гомельском театре кукол, стали участниками новогоднего представления у елки.**

**Профком сотрудников университета закупил сюда на рождественский праздник 200 билетов, которые были розданы на факультеты и в структурные подразделения ГГУ.**

☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺

## УЛЫБНИТЕСЬ!

Экзаменатор и студент:
– Знаешь?
– Знаю.
– Что знаешь?
– Предмет знаю.
– Какой предмет?
– Который сдаю.
– А какой сдаешь?
– Ну это вы придираетесь!

***

Студент спрашивает у профессора:
— У меня будет автомат?
– Конечно, и кирзовые сапоги.

***

Отец отправил сына на учебу в престижное учебное заведение. Проходит какое-то время, и отец получает от сына письмо. Сын пишет: «А еще я записался в студенческий театр. Мне дали роль человека, женатого 20 лет». Отец ему отвечает: «Не расстраивайся, сынок. Занимайся усердней, и тебе дадут роль со словами».

☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺ ☺

**Пожарная безопасность – дело серьезное**

# С ОГНЕМ НЕ ШУТЯТ

**В рамках подготовки трехстороннего договора по обеспечению безопасности жизнедеятельности в свете выполнения республиканских нормативных документов (директива Президента Республики Беларусь от 11 марта 2004 года №1, Указ Президента Республики Беларусь от 31 декабря 2009 года № 671, распоряжение Министерства по чрезвычайным ситуациям РБ от 09 марта 2010 №1) для студентов ГГУ им. Ф.Скорины были подготовлены и проведены мероприятия с участием специалистов Гомельского областного управления МЧС РБ, Центра пропаганды и обучения при учреждении «ГОУ МЧС РБ».**

В ноябре минувшего года студенты факультетов психологии и педагогики, экономического, юридического, геолого-географического, проживающие в общежитии № 4, стали участниками беседы и практического занятия на тему: «Общие правила пожарной безопасности в общежитии. Действия на случай пожара». 7 декабря в читальном зале главного корпуса для студентов всех факультетов было организовано мероприятие «Правила безопасности в зимний период», 15 декабря – для будущих экономистов: «Общие правила пожарной безопасности. Действия на случай пожара. Безопасность в зимний период».





В ходе этих мероприятий были отработаны на практике навыки использования первичных средств пожаротушения: углекислотных и порошковых огнетушителей, средств индивидуальной защиты органов дыхания (самоспасателей), противопожарного полотнища, а также порядок действий при эвакуации из здания при пожаре, правила безопасного использования электротехнических приборов. Демонстрировались фильмы об опасности курения, использования пиротехнических изделий, а также о динамике развития пожара в жилом помещении.

В целях стимулирования познавательной активности студентов использовались разнообразные методические приемы: демонстрационный, иллюстративный, дидактический театр, сочетание беседы с практической работой, мультимедийное сопровождение, создание проблемных ситуаций, приведение ярких фактов, примеров, афоризмов.

Мероприятия прошли в непринужденной обстановке. Самые активные их участники получили сувениры. Интересно, что случайные свидетели занятий просили придти к ним на курс и провести аналогичные профилактические мероприятия.

Активную разъяснительную и познавательную работу со студенческой молодежью университета провели доцент кафедры социальной и педагогической психологии Т.Г. Шатюк, ассистент кафедры А.Н. Певнева. Содействие в предоставлении средств пожаротушения и индивидуальной защиты оказал инженер по пожарной безопасности ГГУ А.А. Рак.

# Остерегайтесь подделок

**В Беларуси возросло количество случаев выявления поддельных российских рублей. Управление внутренних дел Гомельского областного исполнительного комитета отмечает, что за 10 месяцев 2010 года на территории страны было зарегистрировано 1356 фактов фальшивомонетничества (в Гомельской области за аналогичный период времени зафиксировано 155 фактов), из них порядка 45% связаны с обнаружением российских лжеденег. Все это происходит на фоне сокращения случаев распространения поддельных долларов США и евро.**

Такая тенденция отмечается с 2007 года и, по мнению специалистов, связана с прозрачностью границ, а также с высокой степенью интеграции в рамках СНГ. В большинстве своем фальшивки ввозятся из России добросовестными сбытчиками – гастарбайтерами, выезжающими за товаром предпринимателями, гражданами, совершающими туристические и гостевые поездки. Наибольшее распространение на территории Республики Беларусь получили фальшивые денежные банкноты номиналом 5 тысяч рублей ЦБ РФ и номиналом 1 тысяча рублей ЦБ РФ и имеют следующие серийные номера: аЛ12257.., аЛ21501.., аЛ24201.., аЛ97372.., оН37025.., оН73995.., тМ10252.., тМ13992.., тН42148.., тП72125.., ьМ32224.., ьМ34377.., ьМ72184.., ьП40228.

Как правило, поддельная российская валюта изготовлена на струйном принтере и состоит из 2-х склеенных между собой листов. Гражданам следует обращать внимание на:

- водяной знак (по сравнению с подлинной банкнотой наблюдается нечетко, имеет меньший контраст);

- защитную нить (на оборотной стороне лжебанкноты края выходов защитной нити на поверхность неровные, выделяются более четко) и микротекст (знаки имеют значительные расплывы краски, читаются плохо либо не читаются);

- скрытое изображение (кипп-эффект). Справа внизу от изображения памятника находится ленточка, на которой отсутствует кипп-эффект: в подлинных купюрах при боковом освещении просматриваются буквы «РР»;

- микроперфорацию, которая проверяется на просвет (указан номинал банкноты). Для фальшивых денег характерно наличие сквозных микроотверстий различной величины, интервалы между которыми неодинаковы, линии строк искривлены.

УВД Гомельского облисполкома обращается к гражданам с просьбой не покупать валюту с рук и не участвовать в сомнительных сделках, в том числе, находясь за границей. Если Вы распознали подделку, сразу же обращайтесь в милицию. Чем раньше правоохранители получат информацию, тем больше шансов установить преступника. Ни в коем случае не пытайтесь обменять или что-нибудь купить на эти деньги! Ваши действия будут рассматриваться как сознательный сбыт фальшивок со всеми вытекающими последствиями.

**ОВД администрации Центрального района г. Гомеля.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК —
УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны».

Наш адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14.
Тэл.: 60-30-71.
E-mail: rggu@gsu.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г.
Рэгістрацыйны № 263.
РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на ОАО «Полеспечать», г.Гомель, ул.Советская,1.
Ответственность за качество печати несет ОАО «Полеспечать».
Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4006.
Падпісана да друку 12 студзеня ў 10.00.

I SSN 2077- 1053